**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб’екта
і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў

9 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы ліст ад кандыдата выбрачага суб’екта “Каманда Латушкі і Рух “За Свабоду”,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

8 траўня 2024 года ў Выбарчую камісію паступіў ліст ад кандыдата выбарчага суб’екта “Каманда Латушкі і Рух “За Свабоду” Алены Пуцыковіч з просьбай включыць яе са спісу кандыдатаў.

У адпаведнасці з падпунктам 7.1 пункта 7 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года, “кандыдат мае права сам звярнуцца ў Камісію аб выключэнні яго са спіса”. Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што падставы для адмовы ў прашэнні Алены Пуцыковіч адсутнічаюць.

На падставе вышэй выкладзенага, Выбарчай камісіяй

## ВЫРАШАНА:

Кандыдата спіса выбарчага суб’екта “Каманда Латушкі і Рух “За Свабоду” Алену Пуцыковіч пад нумарам 45 - са спісу выключыць.

Унесці адпаведныя змены ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька